# ПЕРАВОЗКА ПРЫБОРАЎ З ЛІТЫЕВЫМІ І ЛІТЫЙ-ІОННЫМІ БАТАРЭЯМІ

У дачыненні да перавозкі пасажырамі літыевых і літый-іонных батарэй, прызначаных для работы розных электронных прыбораў, дзейнічаюць абмежаванні.

У РУП «Нацыянальны аэрапорт Мінск» з улікам рэкамендацый ICAO і IATA пры перавозцы пасажырамі і членамі экіпажаў на паветраных судах устаноўлены наступныя абмежаванні і забароны на перавозку літыевых і літый-іонных батарэй.

| Магутнасць батарэй (Втг) або ўтрыманне літыя (г) | Ў ручной паклажы | Ў багажы | Патрабуецца дазвол авіякампаніі |
|---|---|---|---|
| *≤100 Втг (2 г)<br>у прыборы | ТАК<br>(макс. 15 адз.) | ТАК | НЕ<br>(*> 15 адз. – ТАК) |
| *≤100 Втг (2 г)<br>асобна | ТАК<br>(макс. 20 адз.) | НЕ | НЕ<br>(*> 20 адз. – ТАК) |
| 100<*≤160 Втг<br>у прыборы | ТАК | ТАК | ТАК |
| 100<*≤160 Втг<br>асобна | ТАК<br>(макс. 2 адз.) | НЕ | ТАК |
| *>160 Втг | Забаронены для перавозкі пасажырамі і членамі экіпажу ў зарэгістраваным багажы, ручной паклажы,«пры сабе». Перавозяцца ў адпаведнасці з «Правіламі перавозкі небяспечных грузаў» IATA | | |
| 2 г < * < 8 г<br>у медыцынскім прыборы | ТАК | ТАК | ТАК |
| 2 г < * < 8 г<br>асобна | ТАК<br>(макс. 2 адз.) | НЕ | ТАК |

Прыборы – электронныя прыборы, такія як відэакамеры, смартфоны, ноўтбукі і планшэты, прызначанныя **для асабістага выкарыстання**. Пры перавозцы такога прыбору ў зарэгістраваным багажы яны павінны быць цалкам выключаны і абаронены ад адвольнага ўключэння.

Запасныя літыевыя і літый-іонныя батарэі павінны перавозіцца ў ручной паклажы. Клемы батарэй павінны быць ізаляваныя (абаронены) для прадухілення кароткага замыкання. Кожная батарэя змяшчаецца ў асобны пластыкавы ( або іншы матэрыял, які не праводзіць электрычнасць) чахол.

Прыборы, якія змяшчаюць літыевыя батарэі і першапачаткова прызначаныя для забеспячэння энегіяй іншыя прыборы, напрыклад, паўэрбанкі, разлядаюцца як запасныя батарэі і павінны перавозіцца толькі ў ручной паклажы або пры сабе.

Электронныя цыгарэты, уключаючы е-цыгарэты і іншыя персанальныя курыльныя выпарнікі, якія змяшчаюць батарэі, прызначаныя **для асабістага выкарыстання** пасажырамі, павінны перавозіцца толькі ў ручной паклажы або пры сабе. Пасажыр павінен прыняць меры, каб прадухіліць ненаўмыснае або самаадвольнае ўключэнне прыбору.

**Багаж, які абсталяваны літыевымі батарэямі – «разумны» багаж**

Такія прыстасаванні могуць змяшчаць у сабе літыевыя батарэі, рухавікі, паўэрбанкі, GPS-модуль, GSM-модуль, Bluetooth, RFID або Wi-Fi-модуль. Наяўнасць літыевых батарэй можа супярэчыць розным нарматыўным патрабаванням. Перавозка багажу, які абсталяваны літыевымі батарэямі, за выключэннем літыевых элементаў, можа быць выканана пры захаванні наступных патрабаванняў і ўмоў:

багаж павінен перавозіцца ў пасажырскім салоне ў якасці ручной паклажы (батарэі павінны змяшчаць не больш за 0,3 г металічнага літыю або энергаёмістасць літый-іонных батарэй павінна быць не больш за 2,7 Втг);

калі такі багаж па сваіх характарыстыках (вазе, габарытах) патрабуе перавозкі ў багажным адсеку ў якасці зарэгістраванага, то літыевая батарэя павінна быць вынята з яго і перавезена асобна ў ручной паклажы;

багаж, у якім літыевая батарэя прызначана для зарадкі іншых прыбораў і не можа быць вынята з яго, забаренены да перавозкі (няздымныя батарэі, у якіх колькасць металічнага літыя перавышае 0,3 г або энергаёмістасць якіх больш за 2,7 Втг).

Калі ласка, звяжыцеся з перавозчыкам загадзя, да пачатку палёту, паколькі авіякампаніяй могуць усталёўвацца дадатковыя абмежаванні і правілы.